# Галоўнае наша багацце



**На пачатку лета давялося мне паўдзельнічаць у рабоце журы конкурсу-пленэру юных мастакоў "Фарбы роднай зямлі", прысвечанага 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Праходзіў гэты конкурс-пленэр ужо дзесяты раз на базе Чэрвеньскага раёна і быў арганізаваны Упраўленнем культуры Мінскага аблвыканкама.**



Акрамя работы па ацэнцы твораў юных канкурсантаў, членам журы была прапанавана шырокая культурная праграма. Госці старажытнай Ігуменшчыны прычыніліся да цікавых экскурсій па Філіяле музея Станіслава Манюшкі ў пасёлку Азёрным і па экспазіцыі Хаіма Суціна ў Смілавічах. Наведалі мы бібліятэкі і дамы творчасці Чэрвеньскага раёна, Чэрвеньскі этнаграфічны музей, дзе праходзіла выстава народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якая прадстаўляла творы выхаванцаў мастацкіх навучальных устаноў Мінскай вобласці. Было прыемна ўбачыць сярод выкладчыкаў гэтых устаноў многіх выпускнікоў маёй альма-матэр — БДУ культуры і мастацтваў.

Мне, чалавеку, які часта бывае на канцэртах, нават з удзелам зорак міжнароднага маштабу, было сапраўды цікава пaглядзець праграму, падрыхтаваную Цэнтрам творчасці моладзі горада Чэрвеня да свята вызвалення Беларусі. У адрозненне ад шматлікіх юбілейных мерапрыемстваў гэты канцэрт вызначыўся нестандартнай рэжысурай і адсутнасцю штампаў. Прычым, у асноўным удзельнічалі ў ім дзеці з невялікіх вёсак, багатых на юныя таленты.

Пасля мітусні мегаполіса было прыемна апынуцца ў цішыні вулачак Чэрвеня, адчуць павольны лад жыцця яго жыхароў, пазнаёміцца з выкладчыкамі Чэрвеньскай школы мастацтваў, майстрамі народных рамёстваў, работнікамі культурнай сферы. Пасля такіх сустрэч разумееш, што таленавітыя, шчырыя і добразычлівыя людзі — галоўнае багацце нашай краіны.

**Дзяніс БАРСУКОЎ,**
**дырэктар мастацкай галерэі "Універсітэт культуры"**

***На здымках:* *работы юных канкурсантак Дзіяны Няхайчык і Марыі Гертман.***

***Фота Настассі Калацкай***